


## § 4. Палітычная геаграфія

***Успамінаем.*** Якую інфармацыю вы можаце атрымаць з палітычнай карты свету? Якія асноўныя рысы незалежных дзяржаў? Якія формы кіравання і дзяржаўнага ладу вы можаце назваць для сучасных краін свету?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Веды якіх вучэбных прадметаў вам сёння будуць неабходныя пры вывучэнні гэтай тэмы? Сферай дзейнасці якіх спецыялістаў з'яўляецца палітычная геаграфія?

**Аб'екты і асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі.** Палітычная геаграфія з'яўляецца адным з важных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай геаграфіі і знаходзіцца на стыку навук. Таму шэраг навукоўцаў адводзіць ёй самастойную ролю ў геаграфіі.

Узнікшы ў канцы XVIII ст. як прыродазнаўчая навука, палітычная геаграфія вывучала дзяленне свету на дзяржавы, іх тэрыторыю, узаемнае размяшчэнне, межы і тлумачыла палітычныя працэсы характарам прыродных умоў і ландшафтаў.

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Вядомы французскі асветнік Шарль Луі Мантэск'ё лічыў форму дзяржаўнага кіравання і ладу функцыяй клімату і памераў краіны. Шырокія імперыі схільныя да дэспатычнага кіравання, таму што для стабільнасці ў вялікай па тэрыторыі дзяржаве неабходна, каб аддаленасць месца, куды рассылаюцца загады, ураўнаважвалася хуткасцю іх выканання. Маленькія дзяржавы па сваёй прыродзе павінны быць рэспублікамі, шырокія імперыі — падпарадкоўвацца манарху. Такім чынам, аптымальнай будзе форма дзяржаўнага ладу, якая спалучае перавагі і вартасці рэспубліканскага кіравання з сілай манархіі. Такой формай кіравання Мантэск'ё лічыў федэрацыю — прасторава адзіны саюз суверэнных рэспублік, здольны супраціўляцца ворагу і захоўваць свае памеры без страты дэмакратыі.

Ці мае рацыю Мантэск'ё? Аргументуйце свае меркаванні «за» і «супраць».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзякуючы працам нямецкага географа Ф. Ратцэля (мал. 22), у канцы XIX ст. асаблівасці палітычнага ладу, унутранай і знешняй палітыкі розных дзяржаў пачынаюць вывучаць з улікам геаграфічнага становішча, геаграфічных умоў і культурна-гістарычных асаблівасцей.



Мал. 22. Ф. Ратцэль, нямецкі географ, аўтар працы «Палітычная геаграфія» (1897)

Пазней, калі сталі браць пад увагу прасторавыя і рэгіянальныя асаблівасці развіцця свету, уяўленні аб прадмеце палітычнай геаграфіі значна пашырыліся.

**Палітычная геаграфія — асобная геаграфічная навука, якая вывучае прасторавую арганізацыю палітычнага жыцця грамадства і тэрытарыяльныя спалучэнні палітычных сіл.**

З развіццём навукі пашырыўся пералік аб'ектаў палітычнай геаграфіі (мал. 23).




Мал. 23. Аб'екты палітычнай геаграфіі

Асноўнай задачай палітычнай геаграфіі з'яўляецца характарыстыка агульнай прасторавай карціны палітычнага жыцця краіны і сукупнасці фактараў, якія яе абумоўліваюць.

Вялікая колькасць аб'ектаў паслужыла фарміраванню некалькіх самастойных навуковых напрамкаў. Кожны з іх дынамічна развіваецца ў цяперашні час (мал. 24).




Мал. 24. Асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палітыка-геаграфічнае становішча краіны.** Вывучэнне геаграфічнага становішча мае важнае значэнне і шырока прымяняецца ў геаграфіі. Вылучаюць фізіка-геаграфічнае становішча, эканоміка-геаграфічнае становішча, транспартна-геаграфічнае становішча. У палітычнай геаграфіі на першым месцы знаходзіцца палітыка-геаграфічнае становішча (ПГС).

Эканоміка-геаграфічнае становішча і палітыка-геаграфічнае становішча маюць шмат агульнага. Гэта тлумачыцца тым, што геаграфічнае становішча краіны ў адносінах да транспартных шляхоў, патокаў сыравіны, тавараў і паслуг, інтэграцыйных аб’яднанняў і г. д. будзе аказваць уплыў не толькі на эканамічную, але і на палітычную сітуацыю ў краіне і наадварот.

**Палітыка-геаграфічнае становішча — гэта становішча аб’екта (краіны, яе часткі, групы краін) у адносінах да іншых дзяржаў і іх груп як палітычных аб’ектаў.**

ПГС дзяржавы ў шырокім сэнсе — гэта комплекс палітычных умоў, звязаных з геаграфічным становішчам краіны (рэгіёна), які выяўляецца ў сістэме палітычных узаемаадносін з навакольным светам.

У цэлым пра ПГС можна казаць як пра комплекс адносін дадзенай дзяржавы з іншымі краінамі і тэрыторыямі на трох узроўнях — лакальным, макрарэгіянальным і глабальным, дапоўненых эканамічнымі, гістарычнымі, этнічнымі, канфесійнымі, культурнымі сувязямі.

**Свет і Беларусь.** Якая форма кіравання і дзяржаўнага ладу характэрная для Рэспублікі Беларусь? Назавіце асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь. Як змянілася геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь пасля распаду СССР?

**Дзяржаўныя межы і формы іх змены.** Дзяржаўныя межы — гэта асаблівы тып геаграфічных меж, які вывучае палітычная геаграфія. *Дзяржаўная мяжа* ўяўляе з сябе лінію на паверхні зямлі (сушы або воднай прасторы) і ўяўную вертыкальную паверхню з паветранай прасторай і нетрамі, якія вызначаюць рубяжы тэрыторыі краіны і аддзяляюць яе ад іншых дзяржаў і адкрытых мораў.

У палітычнай геаграфіі вылучаюць некалькі відаў меж (мал. 25).

У гісторыі развіцця чалавецтва дзяржаўныя межы змяняюцца. Гэта можа адбывацца ў наступных мірных формах (мал. 26).

***Папрацуем з атласам.*** Прывядзіце прыклады змен дзяржаўных меж на палітычнай карце свету з 1990 г. і да цяперашняга часу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| | | | |
|---|---|---|---|
| Прыкметы вылучэння меж | Прыродныя | араграфічныя (горныя, раўнінныя) | напр., Пірэнеі (франка-іспанская мяжа) |
| | | водныя (рачныя, марскія, азёрныя) | напр., р. Меконг (мяжа Лаоса і Тайланда), Вялікія азёры (ЗША і Канада) |
| | | геаметрычныя | напр., Алжыр і Лівія |
| | Марфалагічныя | астранамічныя | ЗША і Канада — па 49° пн. ш. Егіпет і Судан — па 22° пн. ш. |
| | Гісторыя і паслядоўнасць узнікнення | каланіяльныя | напр., межы ў рубяжах Французскай Заходняй Афрыкі |
| | | посткаланіяльныя, пасляваенныя, постсацыялістычныя і інш. | напр., мяжа Польшчы пасля Другой сусветнай вайны |
| | | «сталыя» этнакультурныя | напр., паміж Нарвегіяй і Швецыяй |
| | | бар'ерныя (раздзяляльныя) | аддзяляе адну краіну ад іншай з дапамогай мяжы |
| | Функцыі | кантактныя (злучальныя) | служыць збліжэнню краін, спрыяе трансгранічнаму супрацоўніцтву, развіццю эканамічных і культурных сувязей |

Мал. 25. Асноўныя віды дзяржаўных меж




Мал. 26. Формы змены дзяржаўных меж

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Напрыклад, у выніку продажу Аляскі змяніліся дзяржаўныя межы Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў і Расійскай імперыі ў 1867 г. У 1944 г. Тувінская Народная Рэспубліка добраахвотна ўвайшла ў склад СССР. У выніку штучнага прырашчэння сухапутнай тэрыторыі павялічылася плошча Нідэрландаў і змяніліся межы гэтых дзяржаў. Выхад Вялікага Княства Фінляндскага са складу СССР у 1917 г. і Сінгапура са складу Малайзіі ў 1965 г. змяніў іх дзяржаўныя межы. Пасля аб'яднання Федэратыўнай Рэспублікі Германіі (ФРГ) і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (ГДР) у 1990 г. змянілася дзяржаўная мяжа ФРГ (мал. 27). Прыкладам змены дзяржаўнай мяжы ў выніку міжнароднага рашэння з'яўляецца змена меж Індыі і Пакістана ў выніку падзелу штата Кашмір у 1949 г.



Мал. 27. Дзяржаўная мяжа ФРГ пасля аб'яднання

***Паразважаем.*** Чым могуць быць выкліканы тэрытарыяльныя спрэчкі паміж дзяржавамі?

**Памежныя спрэчкі.** Адным з найбольш актуальных пытанняў палітычнай геаграфіі з'яўляецца вывучэнне тэрытарыяльных прэтэнзій, памежных спрэчак паміж дзяржавамі. Сярод іх вылучаюцца чатыры асноўныя віды (мал. 28). Найбольш часта ў свеце адбываюцца *тэрытарыяльныя спрэчкі* з-за кантролю над пэўнай прыцягальнай тэрыторыяй па нейкай прыкмеце.




Мал. 28. Віды памежных спрэчак

Напрыклад, па тапаграфічнай прыкмеце да тэрытарыяльнай спрэчкі адносяць тэрыторыі Літвы і Калінінградскай вобласці Расіі. Гісторыка-культурнай тэрытарыяльнай спрэчкай з'яўляюцца прэтэнзіі Ірландыі на Паўночную Ірландыю.

*Рэсурсныя памежныя спрэчкі* складаюць значную частку канфліктаў пры засваенні прыродных рэсурсаў на кантынентальным шэльфе (нафта, газ), пры сумесным выкарыстанні водных рэсурсаў у засушлівых раёнах (напр., Малі і Буркіна-Фасо, Турцыя і Сірыя). Для таго каб пазбегнуць такіх спрэчак, прымаюцца рашэнні аб сумесным выкарыстанні рэсурсаў (напр., гідраэнергапатэнцыялу р. Парана паміж Бразіліяй і Парагваем) або вылучаюцца сектары з выразнымі межамі дзяржаў (напр., раздзел нафтагазавых рэсурсаў Паўночнага мора паміж прыбярэжнымі дзяржавамі).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў.*** Адрозніваюць пазіцыйныя і функцыянальныя памежныя спрэчкі. *Пазіцыйныя памежныя спрэчкі* ўзнікаюць у выпадку супярэчнасцей у тлумачэнні дамоваў аб правядзенні меж па прыродных рубяжах — рэках (усходні ўчастак расійска-кітайскай мяжы на Амуры), азёрах (возера Чад паміж Нігерам і Чадам). *Функцыянальныя памежныя спрэчкі* сустракаюцца радзей і ўзнікаюць з прычыны прэтэнзій аднаго з бакоў да рэжыму функцыянавання мяжы, строгасцей памежнага кантролю і мытнай палітыкі, якая ўсталявана суседняй дзяржавай. У дадзенай сітуацыі спрэчка вядзецца не пра змену мяжы, а пра памежную палітыку суседняй дзяржавы.

***Папрацуем з атласам.*** Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і палітычную карту свету, знайдзіце дзяржавы, дзе існуюць памежныя канфлікты і тэрытарыяльныя спрэчкі.

**Прыкладная роля палітычнай геаграфіі.** Веды палітычнай геаграфіі маюць вельмі шырокі ахоп і выкарыстоўваюцца ў розных галінах. Да асноўных з іх варта аднесці змены адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны, асаблівасці знешняй палітыкі, прычыны этнічных канфліктаў, геаграфію выбараў і г. д. Запатрабаванасць палітычнай геаграфіі шмат у чым залежыць ад геаграфічнай адукацыі і геаграфічнай культуры грамадства.

**Падвядзём вынікі.** Палітычная геаграфія — геаграфічная навука, якая вывучае ... .

Палітыка-геаграфічнае становішча краіны характарызуецца наступнымі асаблівасцямі ... . Дзяржаўныя межы (марскія і сухапутныя) аддзяляюць ... .

У адпаведнасці з міжнароднымі правіламі межы праводзяцца ў морах, залівах, пралівах, па рэках.

Асноўная частка дзяржаўных меж праходзіць па ... . Прычынамі памежных спрэчак часцей за ўсё бываюць спрэчная тэрыторыя і асваенне рэсурсаў.

***Праверым свае веды.*** 1. Якія асноўныя напрамкі палітычнай геаграфіі? 2. Якія існуюць віды дзяржаўных меж? 3. Прывядзіце гістарычныя прыклады змены дзяржаўных меж. 4. Чым выкліканы памежныя спрэчкі паміж краінамі? Прывядзіце прыклады.

***Ад простага да складанага.*** 1. Якую ролю адыгралі натуральныя межы (горы, рэкі, азёры) у фарміраванні палітычнай карты Еўропы (Азіі, Афрыкі, Амерыкі)? 2. Назавіце як мага больш памежных фізіка-геаграфічных аб’ектаў.

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Назавіце краіны, межы якіх праходзяць: па гарах, морах, пустынях, рэках. 2. Вызначыце пяць краін з максімальнай плошчай сухапутнай тэрыторыі і пяць найбуйнейшых краін па колькасці насельніцтва. 3. Параўнайце спіс гэтых дзвюх груп краін. Зрабіце вывады.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 5. Геапалітыка, месца ў сістэме геаграфічных навук

***Успамінаем.*** Што такое палітычная геаграфія? Што з'яўляецца аб'ектам вывучэння палітычнай геаграфіі? Якія асноўныя рысы палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь?

***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Для чаго сучаснай дзяржаве неабходна выпрацоўваць геастратэгіі? Якія пытанні складаюць сферу інтарэсаў палітычнай геаграфіі і геапалітыкі? Якімі ведамі павінен валодаць сучасны спецыяліст у галіне геапалітыкі?

**Геапалітыка, месца ў сістэме навук.** Адным з асноўных напрамкаў палітычнай геаграфіі з'яўляецца геапалітыка. З'явілася яна ў выніку аналізу міжнародных адносін з выкарыстаннем геаграфічных ведаў на рубяжы XIX–XX стст.

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** Заснавальнікам геапалітыкі лічыцца Арыстоцель, які паказваў на геапалітычную ролю астравоў і пісаў, што в. Крыт па сваім становішчы прызначаны для пануючага ўплыву на Грэцыю. Ці згодны вы са сцвярджэннем Арыстоцеля? Прывядзіце аргументы «за» і «супраць» гэтага выказвання.

Адно з першых азначэнняў, дадзеных у перакладзе з грэчаскай мовы, характарызавала геапалітыку як навуку аб геаграфічнай абумоўленасці розных палітычных працэсаў.

Шведскі географ Р. Чэлен (1864–1922) быў першым, хто ўвёў паняцце «геапалітыка» (мал. 29).



Мал. 29. Р. Чэлен, аўтар тэрміна «геапалітыка»

**Геапалітыка — раздзел палітычнай геаграфіі, які вывучае геаграфічныя адносіны паміж цэнтрамі палітычнай сілы ў свеце і залежнасць знешняй і ўнутранай палітыкі дзяржаў і міжнародных адносін ад сістэмы палітычных, ваенна-стратэгічных, эканамічных, экалагічных фактараў і палітыка-геаграфічнага становішча краіны.**

Аб'ектам геапалітыкі як навукі з'яўляюцца планетарная прастора з дзяржавамі, іх межамі і рэсурсамі, а таксама геапалітычныя працэсы і з'явы ў сусветнай супольнасці і ў часе. Прадметам геапалітыкі выступаюць узаемаадносіны паміж геапалітычнымі суб'ектамі (мал. 30) пры вырашэнні сусветных і рэгіянальных праблем.




Мал. 30. Асноўныя суб'екты геапалітыкі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне